Міжрайпракурору г. Мазыра
Беневаленскаму С. Б.
гр. Целяпуна Уладзіміра Андрэевіча,
пражываючага па адрасе: вул. Палеская, 54 – 44,
г. Мазыр, 247760, Гомельскай вобл.
Тэл. 4 –89 – 45.

ЗАЯВА

04.12.2002 г. адбылося фармаванне Мазырскай гарадской выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў гарадскога Савета дэпутатаў 24 склікання.

Я, Целяпун Уладзімір Андрэевіч, быў вылучаны ў склад Мазырскай гарадской выбарчай камісіі ад Грамадскага аб'яднання БНФ "Адраджэньне".

Так сама ў склад гэтаж-жа камісіі я быў вылучаны і групай выбаршчыкаў – заяву падпісалі 40 (сорак) грамадзянаў г. Мазыра.

Згодна Кастытуцыі Рэспублікі Беларусь, арт. 34, ч. 1, ч. 2, 06.12.2002 года, я пісьмова звярнуўся да старшыні гарсавета Арцёменка В. Р. І старшыні гарвыканкама Барысенка В. В., азнаёміць мяне з матэрыяламі фармавання гарадской выбарчай камісіі і даць пісьмовы адказ па якой прычыне Целяпун У. А. ня быў уключаны у склад камісіі. Папярэдне з такой жа вуснай прапановай да адказных асобаў гарсавета і гарвыканкама звяртаўся і старшыня Мазырсага гарадскога аддзялення ГА БНФ "Адраджэньне" Чаранкоў Юрый Мікалаевіч (тэл. 307 – 13) і атрымаў адмоўны адказ.

Ад старшыні гарадскога Савета Арцёменка я да гэтага часу ніякага адказу так і не атрымаў.

Ад старшыні гарвыканкама Барысенка В. В. (за подпісам першага намесніка Пісаніка па словах выканаўцы адказу Пашынскага, тэл. 22210) я атрымаў адказ не па сутнасці майго пісьмовага звароту:

- мне так і не дазволена азнаёміцца з матэрыяламі фармавання гарадской камісіі (пратаколамі вылучаных у склад камісіі кандыдатур, іх колькасці, прозвішчы і колькасці членаў гарсавета і гарвыканкама, якія прымалі ўдхзел у сумесным паседжанні, вынікі галасавання (за -, супраць -, устрымалася -) калі яно адбывалася, заўвагі, па якім было адмоўлена астатнім кандыдатам) – што з'яўляецца парушэннем маіх канстытуцыйных правоў%
- Мазырская гарадская арганізацыя Грамадскага аб'яднання БНФ "Адраджэньне" пастаўлена на ўлік **рашэннем** гарвыканкама №786 ад 24.08.2000 г. і атрымана Пасведчанне № 00892/786.

Горад Мазыр ня мае юрыдычных адміністрацыйна-тэратарыяльных адзінак з распарадчымі і выканаўчымі органамі дзе можна было б рэгістраваць пярвічныя суполкі гарадскіх грамадскіх арганізацыяў. Мяне так і не азнаёмілі згодна якога артыкула, якога заканадаўчага акта на тэрыторыі г. Мазыра гарадское Грамадскае аб'яднанне павінна мець пярвічныя суполкі.

ПРАШУ ў парадку пракурорскага нагляду за выкананнем Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, закнадаўчых актаў РБ **з а б я с п е ч ы ц ь:**

1. Выкананне кіраўнікамі Мазырскага гарадскога Савета Арцёменка В. Р., Мазырскага гарадскога выканаўчага камітэта Барысенка В. В. **маіх канстытуцыйных правоў** (арт. 34, ч.1, ч.2 Касцітуцыі РБ) і азнаёміць мяне з матэрыяламі фармавання гарадской выбарчай камісіі;
2. Даць адказ **па сутнаці** майго пісьмовага звароту;

ПРАШУ вызначыць **законнасць** адказу гарвыканкама № Т/1505 ад 27.12.2002 г.

Увах. п —
13.01.03.

ПРАШУ **даць адзнаку дзеянням** адказных асобаў Мазырскіх уладаў (Арцёменка В. Р., Барысенка В. В., Пісаніка Л. Ф., Пашынскага М. М.) згодна арт. 49 Выбарчага кодэкса РБ, арт. $167^3$ Адміністрацыйнага кодэкса РБ, арт. 191, 192 Крымінальнага кодэкса РБ.

Да заявы дадаюцца наступныя дакумэнты:

- ксэракопія пратакола №4/02 паседжання Рады Мазырскага гарадскога аддзялення ГА БНФ "Адраджэньне" - 1 экз.;
- ксэракопія РАШЭННЯ аб пастаноўцы на ўлік МГА ГА БНФ "Адраджэньне" №786 ад 24.08.2000 г. – 1 экз.;
- ксэракопія ПАСВЕДЧАННЯ аб рэгістрацыі арганізацыйнай структуры ГА БНФ "Адраджэньне" №00892/786 – 1 экз.;
- ксэракопія Заявы выбаршчыкаў аб вылучэнні Целяпуна У. А. ў склад Мазырскай гарадской выбарчай камісіі (увах. № 19 ад 03.12. 2002 г.) – 1 экз. (на 5 аркушах);
- ксэракопія звароту да старшыні гарсавета Арцёменка В. Р. І старшыні гарвыканкама Барысенка В. В. – 1 экз.;
- адказ Мазырскага гарвыканкама ад 27.12.2002 г. № Т/1505 – 1 экз.

____________________ ____________________(У. А. Целяпун)